чаюць у сваім напісанні лацінскія літары і словы, напісаныя кірыліцай. Найбольш частотныя адзінкі сярод варварызмаў – *Web, PC, CD, WWW, World Wide Web, IBM, DOS* – і паўварварызмаў – *CD-ROMны, CDшка, IBM-падобны, рэжым on-line, рэжым off-line, Web-старонка, WWW-старонка* і інш.

Такім чынам, камп’ютарная лексіка адносіцца да пасіўнага слоўніка і змяшчае ў сваім складзе спецыяльныя тэрміны, прафесіяналізмы і жаргонную лексіку. Дзякуючы свайму дынамічнаму характару і розным лексіка-стылістычным элементам, камп’ютарная лексіка, несумненна, і надалей будзе прыцягваць увагу даследчыкаў.


1. Барковіч А. А. Беларускі корпус тэкстаў: Інтэрнэт-дыскурс // Веснік БДУ. Сер. 4. 2013. № 2. С. 26–29.
2. Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://knihi.com (дата доступу: 05.01.2016).
3. Ваулина Е. Ю. Толковый словарь пользователя PC. Санкт-Петербург, 1998.
4. Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://be.wikipedia.org/wiki (дата доступу: 12.01.2016).
5. Slounik.org: Беларускія слоўнікі і энцыкляпэдыі [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.slounik.org (дата доступу: 14.01.2016).



***А. А. Прыгодзіч,***
*кандыдат філалагічных навук*
*дацэнт кафедры нямецкай мовы*
*факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ*


## Прыназоўнікава-іменныя канструкцыі вытворча-гаспадарчых онімаў

Тапанімічныя назвы, якія ўзнікаюць на розных этапах развіцця грамадства, нясуць адбітак сваёй эпохі. Так, у аснову наймення трапляе тая рэалія, якая з’яўляецца характэрнай, важнай для пэўнага часу. У адзін перыяд – гэта прыродныя арыенціры на мясцовасці, у другі – назва калектыву першапасяленцаў, якія займаліся тым ці іншым промыслам. Выбар тых або іншых тапонімаўтваральных асноў вызначаецца, у першую чаргу, спецыфікай сацыяльна-эканамічнага жыцця народа, фізіка-геаграфічнымі асаблівасцямі мясцовасці. Такім чынам, лексічны матэрыял для тапонімаў выбіраўся чалавекам не выпадкова, а з улікам сфер дзейнасці, гісторыі і грамадска-эканамічнага жыцця [8, с. 180]. Адным з вынікаў іменалагічнага працэсу з’яўляецца наяўнасць вытворча-гаспадарчых назваў у тапаніміі (*Буда, Гута, Смольня, Рудня, Меднікі, Слесары, Катляры, Паташ, Смалярня, Борць* і інш.).

Спецыфічны пласт вытворча-прамысловых тапонімаў складаюць найменні ў форме **прыназоўнікава-іменных канструкцый**. Неабходнасць намінацыі і дыферэнцыяцыі населеных пунктаў, гор, рэк, урочышчаў узнікла, як лічаць даследчыкі, на самых ранніх ступенях развіцця культуры, і прасцейшай формай такога тапоніма з’яўляецца прыназоўнікавая канструкцыя [4,

с. 134]. Назвы гэтага тыпу сустракаюцца яшчэ ў гістарычных помніках пісьменства XIV–XVII стст. Прыназоўнікавыя канструкцыі, або так званыя арыентуючыя назвы, узніклі на базе лакальных арыенціраў-мікратапонімаў. Марфалагічны склад вылучаных намі вытворча-прамысловых тапонімаў можна ўмоўна падзяліць на дзве групы:

1) тапонімы, якія ўтвораны па мадэлі **«прыназоўнік + субстантыў»**, у якой у функцыі апошняга кампанента выступае мікратапонім-рэдублікат або айконім. У іменнай частцы такіх утварэнняў вытворча-прамысловага тыпу пакладзены ўласныя назоўнікі ва ўскосных склонах: *ля Бортніка* (назва ўрочышча), *пад Будзішча* (месца каля возера), *пад Смалярняй* (месца ў лесе перад смалярняй), *пад Гута* (невялікая сенажаць уздоўж рэчкі ў напрамку вёскі Гуты), *каля Печы* (урочышча ў наваколлі в. Сіманавічы), *каля Цагельні* (урочышча ў наваколлі в. Сіманавічы), *за Мельнікам* (назва ўрочышча) [4, с. 137].

Прасторавыя адносіны паміж дэнататамі выражаюцца прыназоўнікамі *ля, пры, пад, каля,* якія служаць для вызначэння месца аб'екта ў адносінах да іншага геаграфічнага аб'екта;

2) тапанімічныя словазлучэнні, якія складаюцца з дзвюх частак. Першую ўтварае тапонім у назоўным склоне, а другую – прыназоўнікавая канструкцыя, што паясняе гэты тапонім: *Слабада Цагельня пры в. Цагельня Гаева, Будка пры будцы-концы, Будкі на Маскоўска-Віндава-Рыбінскай ч., в. Кузніца пры памесці Шалыгі.* Прыназоўнікавыя канструкцыі ў такіх назвах абазначаюць месца аб'екта (*Слабада Цагельня, Будка, Будкі, Кузніца),* якое ўдакладняецца другім тапонімам ці іншым аб'ектам *(пры в. Цагельня Гаева, пры будцы-концы, на Маскоўска-Віндава-Рыбінскай ч., пры памесці Шалыгі).*

Характэрнай асаблівасцю такіх тапонімаў-арыенціраў з'яўляецца канкрэтная намінатыўнасць, таму што «па сваёй структуры прыназоўнікава-іменныя словазлучэнні блізкія да спалучэнняў агульных слоў, сінтаксічна яны ўтвараюць канструкцыі няпоўных сказаў і ў той жа час выконваюць намінатыўную функцыю, уласцівую ўласным імёнам» [5, с. 12].

Падобныя адзінкі нараджаліся тады, калі ўзнікла неабходнасць апісаць месцазнаходжанне дэнатата, і, на думку Ю. Карпенкі, існаванне такой формы з'яўляецца часовай з'явай [3, с. 36–45]. Калі ўзрастае значнасць месца абазначэння, то разгорнутыя прыназоўнікава-іменныя канструкцыі могуць перааформіцца ў больш звыклую для тапанімікі, спрошчаную структуру. «Такія абазначэнні яшчэ нельга разглядаць як канчаткова сфарміраваны тып уласных імёнаў – яны займаюць прамежкавае становішча паміж уласна тапонімамі і агульнымі імёнамі» [2, с. 103]. Так, калі разгорнутыя, арыентаваныя назвы ў большай ступені былі характэрны для XVI ст., то з цягам часу такія складаныя канструкцыі ўжо не адпавядалі функцыянальнай спецыфіцы тапанімічнай сістэмы і спрашчаліся да цэльнааформленых тапонімаў: *Слабада Цагельня пры в. Цагельня Гаева > в. Слабада Цагельня, в. Будка пры будцы-концы > в. Будка, в. Будкі на Маскоўска-Віндава-Рыбінскай ч. > в. Будкі, в. Кузніца пры памесці Шалыгі > в. Кузніца* [9].

У выніку трансфармацыі прыназоўнікава-іменных канструкцый (зрашчэнне прыназоўніка з субстантывам ці ад’ектывам, а таксама прыцягненне суфіксальных сродкаў) сфарміраваліся рэдублікатныя ўтварэнні, якія ў сінхронным плане паслужылі базай для ўтварэння прэфіксальных і прэфіксальна-суфіксальных канструкцый. Мы падзяляем пункт гледжання тапаністаў-даследчыкаў аб тым, што ў плане дыяхраніі тапонімы тыпу *Зарака, Падгара, Заруда* ўзніклі шляхам лексікалізацыі, г. зн. не шляхам далучэння прэфікса да асновы, а шляхам адпадзення флексіі ў назоўным склоне, якая можа з’явіцца ва ўскосных.

Такія найменні паходзяць ад прыметнікаў, а новая адзінка выступае як нешта больш простае па сваёй структуры, калі флексія ўскоснага склону замяняецца флексіяй назоўнага склону: *За ракою* > *Зарака, Пад гару* > *Падгара, За рудою* > *Заруда.* Утваральным сродкам пры гэтым выступае прэфікс [7, с. 136]. Паказчыкам з’яўлення семантыкі ў новай адзінцы з’яўляецца трансфармаваны тапонім – у *Заруду,* і ўтварэнне новых тапонімаў па гэтай мадэлі: *Зазаводка.*

Падобныя трансфармацыі характэрны не толькі на славянскай моўнай тэрыторыі, яны сустракаюцца таксама і ў нямецкай мове: *Am See* > *Amsee, Am Berg* > *Amberg, Am Bach* > *Ambach, Im Hof* > *Imhof* [1, с. 65].

Вылучаныя канструкцыі вытворча-гаспадарчых тапонімаў адносяцца да непрадуктыўных тыпаў утварэння. Таму прыназоўнікава-іменныя канструкцыі складаюць усяго 1,1 % ад агульнай колькасці вытворча-гаспадарчых назваў.

На сінхронным зрэзе прэфікс з’яўляецца асноўным словаўтваральным элементам у названых тапонімах, а прыназоўнікава-іменныя словазлучэнні паслужылі базай для ўтварэння прэфіксальна-суфіксальных і прэфіксальных канструкцый [6, с. 12].

1. Будзько П. С. Тыпалогія састаўных айконімаў (на матэрыяле беларускай і нямецкай моў) // Беларуская анамастыка: Зб. арт. / АН БССР. Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. Мінск, 1985. С. 52–67.

2. Капылоў І. Л. Тапанімія беларускіх дзелавых помнікаў XV–XVIII стст.: Дыс. … канд. філал. навук. Мінск, 2001.

3. Карпенка Ю. А. Топонимы и географические термины // Вопросы географии. 1970. № 81. С. 25–30.

4. Карсакова М. М. Прыназоўнікава-іменныя канструкцыі і адносныя з імі прэфіксальныя ўтварэнні ў мікратапаніміі Гомельшчыны // Пытанні беларускай тапанімікі: Матэр. першай бел. тапанім. канф. (Мінск, 1–3 снеж. 1967 г.). Мінск, 1970. С. 134–142.

5. Лемтюгова В. П. Восточнославянская ойконимия аппелятивного происхождения. Минск, 1983.

6. Прищепчик А. М. Микротопонимия Столбцовщины: Автореф. дис. … канд. филол. наук. Минск, 1970.

7. Прищепчик А. М Микротопонимы типа *За ракой, Зарака, Зарэчча* // Конференция по топонимике Северо-Западной зоны СССР. Рига, 1966. С. 130–136.

8. Радзіваноўская Н. А. Да пытання лексіка-семантычнай класіфікацыі беларускіх айконімаў, суадносных з назвамі раслiннага свету // Культура мовы і грамадства: Матэр. Міжнар. навук.-практ. канф., (Мінск, 5–6 снежня 2002 г.). Мінск, 2002. С. 180–182.

9. Список населенных мест Витебской губернии. Витебск, 1906.